# ИСТОРИЧЕСКАЯ ДИНАМИКА И ДУХОВНАЯ КУЛЬТУРА ОБЩЕСТВА: РЕГИОНАЛЬНЫЙ И ГЛОБАЛЬНЫЙ КОНТЕКСТ

## ВІЦЕБСКАЯ ГАРАДСКАЯ ДУМА ВА ЎМОВАХ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 г.

*В.У. Акуневіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Органы гарадскога самакіравання паўстаюць у момант, калі гарады пачынаюць адыгрываць важную ролю ў жыцці грамадства. На гістарычным шляху свайго развіцця яны не раз відазмяняліся. У многім гэта было абумоўлена палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі развіцця гарадоў. Асабліва гэта сказвалася ў пераломныя эпохі. Такім пераломам стаў 1917 г., калі ва ўмовах першай сусветнай вайны, у выніку лютаўскай рэвалюцыі Расія стала самай свабоднай з усіх ваюючых краін. Гэтым адкрывалася перспектыва пошуку дэмакратычных, найбольш прыдатных шляхоў развіцця гарадскога самакіравання.

**Матэрыял і метады.** Работа напісана на падставе матэрыялаў перыядычнага друку. У працэсе даследавання выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У 1917 г. Віцебск быў прыфрантавым горадам. З-за энергетычнага і фінансавага крызісу, недахопу сыравіны, выкліканых вайной і развалам эканомікі, былі закрыты многія прадпрыемствы, панавалі беспрацоўе і інфляцыя, харчовы крызіс. Яшчэ адной сур'ёзнай праблемай было бежанства. Так, на 1916 г. у горадзе пражывала 104233 чал., з іх больш 17 тыс.складалі бежанцы [1]. У 1917 г. насельніцтва павялічылася да 120 тыс., і ў асноўным за кошт бежанцаў[2].

Усё эта не магло не выклікаць сацыяльную напружанасць, рост крыміналізацыі гарадскога стану, прастытуцыі, п'янства. Толькі за першыя два месяцы 1916 г. у горадзе было здзейснена 79 злачынстваў, з якіх адно забойства і замах на забойства, 66 выпадкаў крадзяжу [3] і г.д.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. разбурыла адны і паралізавала другія органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання, што значна пагоршыла сітуацыю ў Віцебску. Каб падтрымліваць грамадскі парадак у Віцебску, па ініцыятыве членаў гарадской думы 4–5 (17–18) сакавіка 1917 г. быў створаны гарадскі Грамадскі камітэт (камітэт грамадскай бяспекі). Другая назва больш дакладна вызначала яго мэты. Па свайму складу і метадах дзеяння гэта была самадзейная грамадска-палітычная арганізацыя дэмакратычнага характару, якая спалучала функцыі часовага неафіцыйнага органа ўлады і грамадскай арганізацыі. У яго ўвайшло 243 чалавека ад 48 арганізацый і ўстаноў, як ад Саветаў рабочых дэпутатаў, так і карпарацыі чыноўнікаў, нацыянальных арганізацый, гарадской думы, кааператываў і інш. Стварыўшы 6 секцый па накірунках дзейнасці камітэт ажыццяўляў кіраванне горадам: ствараў міліцыю для аховы парадку, рэарганізоўваў судовыя ўстановы і харчовы апарат, арганізоваў урадавыя структуры, кантраляваў працу хлебапякарняў, рэгуляваў цэны, змагаўся з тайнымі кабакамі і прытонамі і г.д. Падобныя камітэты ствараліся ў мікраёнах і, нават асобных вуліцах горада, якія таксама знаходзілі работу. Так, камітэт па ахове "Грязной" вуліцы хадайнічаў перад часовай гарадской думай аб перайменаванні яе ў Нова-Смаленскую ці Антакольскую [4].



Репозиторий ВГУ

Гарадская дума, якая была створана яшчэ да рэвалюцыйных падзей на цэнзавай аснове, бяздзейнічала. Таму губернская земская нарада 25–28 сакавіка (7–10 красавіка) 1917 г. пад напорам сацыялістычных партый намеціла стварэнне часовай гарадской думы з прадстаўнікоў гарадскога Грамадскага камітэта (25 чал.) Саветаў (40 чал.), уключыўшы 15 прадстаўнікоў старой цэнзавай думы [5]. Такое рашэнне выклікала пярэчанне з боку старой, цэнзавай думы, якая пагаджалася толькі на пашырэнне свайго складу да новых выбараў. Канфлікт прыйшлося ўладжваць Міністэрству ўнутраных спраў. І на пачатку яно стала на бок старой думы (тэлеграма тав. міністра У.С.Авінава), што выклікала абурэнне і пратэст з боку сацыялістычных партый, перад якім Часовы ўрад вымушаны быў адступіць (тэлеграма кн. Львова). Падзеі канфлікту суправаджаліся бурным абмеркаваннем у мясцовым друку праблем гарадскога самакіравання.

15 (28) мая 1917 г. на сходзе прадстаўнікоў Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, сацыялістычных партый, прафсаюзаў, гарадскога Грамадскага камітэта была створана Часовая гарадская дума, якая прыняла на сябе абавязкі па выкананні гаспадарчых функцый гарадскога самакіравання і па арганізацыі выбарчай кампаніі ў новы склад гарадской думы на дэмакратычных падставах.

Першыя ж пасяджэнні Часовай гарадской думы, акрамя пытанняў падрыхтоўкі выбараў, выявілі шмат актуальных праблем жыццезабеспячэння горада, а менавіта праблем: адукацыі – з 8 тыс дзяцей 8-11 гадоў 1 тыс. не вучылася, аховы здароўя – акрамя заразных бальніц іншыя адсутнічалі, гарадскі вадаправод, які знаходзіўся ў руках прыватнай кампаніі, працаваў нездавальняюча, становішча салдацкіх сем'яў, стварэнне міліцыі, забеспячэнне раўнапраўя моў у дзейнасці управы і г.д [6].

Аднак ужо першыя крокі дзейнасці выявілі слабую актыўнасць галосных Часовай гарадской думы, што вымусіла прадстаўнікоў сацыялістычнага блока звяртацца да сваіх аднапартыйцаў з патрабаваннем павелічэння актыўнасці дзейнасці думы. Увогуле праблема грамадскай актыўнасці ў гарадскім жыцці таго часу стаяла вельмі вострa, што праявілася, напрыклад, пад час выбараў ва Устаноўчы сход – толькі $^{1}/_{3}$ цывільнага насельніцтва з правам голасу прыняла ўдзел у выбарах, гэтак сама і ва ўсіх грамадскіх арганізацыях, актыўны ўдзел прымалі $^{1}/_{2}$ – $^{1}/_{3}$ іх складу. Сацыялістычны блок нават быў вымушаны стварыць часовае бюро блока з 3-х чалавек, каб наладзіць работу блока [7].

27 жніўня (9 верасня) 1917 г. у г.Віцебску былі праведзены выбары ў гарадскую думу, што стала выпрабаваннем сіл палітычных партый і аб'яднанняў перад выбарамі ва Устаноўчы сход (своеасаблівая прыкідка). Было зарэгістравана 20 кандыдацкіх спісаў па выбарах у гарадскую думу, якія прадстаўлялі практычна ўвесь спектр палітычных і грамадскіх арганізацый – ад партыі народнай свабоды (кадэты) – да бальшавікоў. Перамог сацыялістычны блок, які быў прадстаўлены самым вялікім спісам у 102 чалавекі. Ён жа і склаў кіраўніцтва гарадской думы, якая пачала сваю працу з 11 (24) верасня [8]. Але ж у гэты час Расія каціліся па шляху ўсеагульнага крызісу да кастрычніцкай рэвалюцыі.

Апошнім уздымам актыўнасці гарадской думы былі падзеі 28 лістапада (11 снежня) 1917 г., ў дзень мяркуемага адкрыцця Устаноўчага сходу. Адбылося ўрачыстае пасяджэнне гарадской думы з удзелам прадстаўнікоў усіх палітычных партый, акрамя бальшавікоў, з вітаннем пераломнага моманту і з прапановамі ўвекавечвання гэтай значнай падзеі. 2 студзеня 1918 г. рашэннем Савета салдацкіх і рабочых дэпутатаў дума была рапушчана.

**Заключэнне.** Такім чынам у сакавіку – кастрычніку 1917 г., улічваючы вопыт мінулага, ішоў пошук новых форм гарадскога самакіравання. Як



Репозиторий ВГУ

пераходная форма выкарыстоўваўся шырокапрадстаўнічы гарадскі Грамадскі камітэт. Наладзіць гарадское жыццё ва ўмовах вайны і рэвалюцыі спрабавала гарадская дума. Аднак палітычныя барацьба і супярэчнасці не дазволілі стварыць стройную і ўстойлівую сістэму самакіравання. Новыя органы не паспелі умацавацца. Адзіным органам гарадскога самакіравання сталі Саветы пад жорсткім кантролем партыі бальшавікоў.

Спіс літаратуры


1. Витебский листок. 1916. 3 мая.
2. Известия Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов. 1917. 21 мая.
3. Витебский листок. 1916. 3 мая.
4. Известия Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов. 1917.
5. Там жа. 18 мая.
6. Там жа. 21 мая.
7. Там жа. 17 июня.
8. Там жа. 20 июня; 12 сентября.


## КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ Ў 1920-я ГАДЫ


*Т.В. Андруцкая*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Краязнаўчы рух у 20-я гады XX стагоддзя разгарнуўся па ўсёй краіне. Гэты перыяд характэрызуецца павелічэннем колькасці археалагічных даследванняў, утварэннем краязнаўчых таварыстваў і гурткоў, адкрыццём і рэарганізацыяй музеяў. Была наладжана сувязь паміж краязнаўчымі таварыствамі, адбывалася знаёмства з вынікамі іх дзейнасці. Краязнаўчыя арганізацыі хутка раслі. На сённяшні дзень сістэматызацыя назапашаных у 1920-я гады ведаў, вывучэнне выпрацаваных методык з’яўляюцца надзвычай актуальнымі.

Мэта працы – ахарактарызаваць краязнаўчы рух у Віцебску ў 20-я гады XX стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** Работа грунтуецца на дакументах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. У даследаванні скарыстаны агульнагістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На мяжы XIX–XX ст. Віцебск з’яўляўся буйным краязнаўчым цэнтрам. Яшчэ ў канцы XIX ст. у Віцебку выказваліся думкі пра ўтварэнне Археалагічнага таварыства для вывучэння Віцебкага края. У 1909 г. была ўтворана Віцебская вучоная архіўная камісія, якая займалася аховай помнікаў даўніны, вяла археалагічныя раскопкі, выдавала навуковыя працы па гісторыі, геаграфіі, археалогіі і этнаграфіі Віцебшчыны. Былі ўтвораны архіў, бібліятэка і музей. Па ініцыятыве камісіі было створана Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Камісія праіснавала да 1919 г.

У студзені 1920 г. ўзнікла Камісія па ахове гістарычных помнікаў. Вынікам яе дзейнасці стала апісанне помнікаў архітэктуры, утварэнне Губернскага гісторыка-археалагічнага музея.

Некалькі год пры Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута існаваў гурток, а потым этнаграфічная камісія, якія займаліся зборам, вывучэннем і выданне матэрыялаў па матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Репозиторий ВГУ